Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь:

Юбілей

«МЫ МОЖАМ І ПАВІННЫ ЗРАБІЦЬ БОЛЬШ!»

Мы жывём у зменлівым свеце, дзе ўсе сацыяльныя, палітычныя, эканамічныя працэсы няспынна паскараюцца, трансфармуюцца. Для таго, каб проста паспяваць зарыентавацца ў абстаноўцы, кожны сучасны чалавек вымушаны трымаць руку на пульсе падзей. Што ж гаварыць пра кіраўнікоў — людзей, якія нясуць адказнасць за свой калектыў і абавязаны не толькі рабіць аналіз працэсаў, што адбываюцца ў грамадстве, але і прадбачыць іх. Флагманам падрыхтоўкі кіраўніцкіх кадраў у нашай краіне з'яўляецца Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, якая днямі адзначае сваё 20-годдзе. Што сабой уяўляе навучанне заўтрашніх лідараў, мы папрасілі расказаць прарэктара па вучэбнай рабоце, доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара Ігара ГАНЧАРОНКА:

— У сённяшніх умовах адукацыя становіцца магутным рэсурсам развіцця як асобнага чалавека, так і сацыяльнай сістэмы ў цэлым. З улікам зменлівасці сусветных працэсаў мы павінны вучыць моладзь нават не сённяшнім ведам, і тым больш не ўчарашнім, а заўтрашнім: будучым тэхналогіям, працэсам, кампетэнцыям, якія мы павінны прадбачыць і якія стануць неабходнымі для чалавека ў перспектыве. Гучыць, магчыма, парадаксальна, але мы павінны вучыць будучыні. І гэта прынцыпова для падрыхтоўкі кіраўніка.

Нягледзячы на ўсе тэорыі аб ролі дзяржавы і яе жыццядзейнасці ва ўмовах працэсаў глабалізацыі, незалежная дзяржава была, ёсць і застанецца. Больш за тое, роля дзяржавы ў развіцці грамадства будзе ўзмацняцца. Гэта адзін з пастулатаў беларускай мадэлі развіцця. Аднак, як падкрэсліў Прэзідэнт падчас візіту ў Акадэмію кіравання, роля дзяржавы — быць не начным вартаўніком, а інстытутам, які спрые развіццю асобы і грамадства ў цэлым; тым, што мы называем квітнеючай і моцнай дзяржавай, камфортнай для пражывання кожнага жыхара.

Кіраўніцтва як улада — гэта магчымасць праявіць свае лідарскія здольнасці, але адначасова гэта і адказнасць, выпрабаванне «меднымі трубамі». Для таго, каб кіраўнік не разбэсціўся ўладай (а такія выпадкі здараюцца, калі выяўляюцца праявы бюракратызму і карупцыі), у яго павінен быць унутраны маральны стрыжань, падмацаваны пачуццём грамадзянскай адказнасці і патрыятызму. Калі мы здолеем сфарміраваць такі стрыжань, тады выпрабаванне ўладай пройдзе паспяхова, чалавек зможа развівацца як кіраўнік, а не дэградзіраваць у бюракрата ці карупцыянера.

Увогуле, гэта праблема не толькі Беларусі. Мы бачым, што адбываецца ў свеце. Безумоўна, выкараніць карупцыю цалкам наўрад ці атрымаецца, але ўжо ёсць станоўчыя прыклады таго, як можна змагацца з ёй максімальна эфектыўна, з мінімальнымі затратамі. Узгадаю той жа Сінгапур з жорсткім дзяржаўным кантролем за выкананнем дзейнага заканадаўства. Мы называем гэта прававой дзяржавай, дзе ўсё падпарадкавана закону, у тым ліку і маральнага. Цікава, што многія нашы замежныя партнёры параўноўваюць з Сінгапурам Беларусь.

— Як сфарміраваць духоўны маральны стрыжань кіраўніка ў студэнтаў?

— Вядома, гэта складана. Напрыклад, Злучаныя Штаты Амерыкі сёння заяўляюць, што ў іх здарыўся крызіс лідарства. І гэта пры тым, што яны першымі яшчэ 20 гадоў таму сфарміравалі ў сябе такую акадэмічную дысцыпліну, як лідарства. Трэба разумець, што лідарства — не зусім звычайная акадэмічная дысцыпліна, такая як, скажам, біялогія, дзе ёсць вызначаны набор вузка спецыялізаваных ведаў, прысвечаных вывучэнню пэўных з'яў. Лідарства ахоплівае ўсе бакі жыцця. Адпаведна веды павінны давацца па ўсіх кірунках жыццядзейнасці будучага кіраўніка. Тут нельга абмінуць увагай пытанні культурнай успрымальнасці, расавай і рэлігійнай цярпімасці, пытанні маральнай праніклівасці, здольнасці прымаць рашэнні ва ўмовах рызыкі і г.д. Атрымліваецца такая комплексная дысцыпліна, якая да гэтага часу застаецца прадметам гарачых дыскусій.

— Увогуле, ці можна навучыць лідарству, альбо лідарамі нараджаюцца?

— Па вялікім рахунку, справядлівыя абодва сцвярджэнні. Калі мы гаворым аб палітычным лідарстве, то, напэўна, людзі з такімі задаткамі нараджаюцца. А што тычыцца лідараў больш сціплага фармату, якія павінны быць у кожным калектыве, на прадпрыемстве, у грамадскай арганізацыі, то адпаведныя веды і ўменні можна сфарміраваць у ВНУ. У Акадэміі кіравання мы актыўна развіваем так званы кампетэнтнасны падыход. Гэта азначае, што мы даём не толькі веды, а яшчэ «прышчапляем» студэнтам настрой на вырашэнне пастаўленай задачы, імкненне давесці справу да выніку, а не імітаваць вырашэнне. Лідар — гэта не той, хто патэнцыяльна здольны вырашыць задачу, а той, хто ў стане рэалізаваць свой намер у рэальным жыцці.

Вельмі важна выявіць лідарскія якасці на больш ранніх стадыях развіцця асобы, бо далёка не ўсё можна сфарміраваць у вышэйшай школе. Выхаваннем лідара павінны займацца і сям'я, і грамадства. У Акадэміі кіравання мы вырашаем сваю канкрэтную задачу, якая заключаецца ў тым, каб прыцягнуць да нас не толькі выдатнікаў вучобы, але і нефармальных лідараў, стымуляваць іх павышаць свой адукацыйны ўзровень. Сённяшняя трыяда лідарства можа быць сфармулявана наступным чынам: высокі адукацыйны ўзровень (бо адукацыя — магутны рэсурс сацыяльнага развіцця), здольнасць натхняць і арганізатарскі талент.

— Аднак гэтыя якасці не паддаюцца колькаснаму вымярэнню. Як замерыць талент, магчымасць натхняць, весці за сабой?

— Такое зрабіць немагчыма, таму і не існуе нейкай універсальнай формулы падрыхтоўкі лідараў. Мы вывучылі перадавы міжнародны вопыт, аднак ідзём сваім уласным шляхам, бо далёка не ўсё з распрацовак тых жа амерыканцаў можна ўжыць і яны неабавязкова будуць карысным для нас. Сфарміраваць лідара мы павінны на аснове пэўных каштоўнасцяў, уласцівых той ці іншай арганізацыі ці грамадству, а каштоўнасці ў беларускім грамадстве могуць адрознівацца ад каштоўнасцяў іншай дзяржавы. Калі мы будзем ігнараваць свае каштоўнасці, традыцыі, устоі, якія прайшлі выпрабаванне часам, то наша лідарства проста не будзе эфектыўным, жыццядзейным. Патрыятызм — гэта аснова, гэта каштоўнасць, якую мы павінны выхаваць у нашага маладога пакалення. Вось чаму нашы студэнты павінны добра ведаць гісторыю развіцця дзяржавы і тых асоб, якія ўнеслі свой уклад у яе развіццё. Яны павінны ведаць гісторыю развіцця Акадэміі кіравання (хоць нам усяго 20 гадоў, мы стварылі ўласны музей).

Патрыятызм характэрны для ўсіх дзяржаў свету. І ўсе разумеюць, што адданасць сваёй краіне і грамадству з'яўляецца вельмі важным стымулам для далейшага развіцця. Наш Прэзідэнт падкрэслівае, што ў кіраўніка павінен быць духоўны стрыжань. І задача Акадэміі кіравання — сфарміраваць яго ў будучых лідараў.

— А як гэта рэалізуецца на практыцы?

— Асноўная форма ажыццяўлення нашай выхаваўча-ідэалагічнай работы — гэта праектная дзейнасць. Праект мае канкрэтную мэту, выканаўцаў, разлічаны на пэўны прамежак часу. Калі ж мэта дасягнута, ставіцца новая, пачынаецца наступны праект. Пры гэтым мы заўсёды маем магчымасць прыцягнуць у праекты новых удзельнікаў, што дае многім людзям шанц праявіць свае лідарскія здольнасці. У нас рэалізоўвалася шмат праектаў, але самым важным я лічу сумесны праект з Мінгарвыканкамам «Мінская змена». З шэрагу маладых людзей, якія ўключаны ў перспектыўны кадравы рэзерв ВНУ Мінска, мы намагаемся адабраць найбольш дастойных праз рэалізацыю канкрэтных праектаў. З аднаго боку, гэта дае моладзі магчымасць праявіць сябе, з другога — адшліфаваць, «адтачыць» лідарскія здольнасці пад канкрэтную лідарскую дзейнасць. Праект «Мінская змена» добра сябе зарэкамендаваў, таму сёлета мы выйшлі з ініцыятывай аб яго рэалізацыі і ў іншых абласцях краіны. Аднак пачыналі мы з таго, што на базе Акадэміі кіравання стварылі ўнутраную школу лідарства, дзе сталі рыхтаваць моладзь да ўдзелу ў конкурсе «Мінская змена»... Увогуле, курс лідарства складана фармалізаваць, таму асобнай такой акадэмічнай дысцыпліны ў нас няма. А вось праз пазааўдыторскую, нефармальную дзейнасць мы змаглі папрацаваць з маладымі людзьмі ў гэтым кірунку. Хлопцы і дзяўчаты ў канкурэнтнай барацьбе маглі паказаць сваю адукаванасць і веды, здольнасць натхняць, а таксама свой рэалізатарскі талент.

Немагчыма даць універсальнага азначэння лідарства. Адназначнай фармулёўкі няма. Некаторыя сёння разглядаюць лідарства як вяршыню кіравання, іншыя — як кампанент кіраўніцкай дзейнасці, трэція сцвярджаюць, што лідарства — гэта здольнасць арганізаваць сваю жыццёвую прастору так, каб у ёй хацелася жыць і развівацца не толькі табе, але і іншым. Усё гэта мае сэнс... Больш за тое, часта гавораць пра фармальнае і нефармальнае лідарства, што абумоўлівае раздваенне кіраўніцкіх функцый. Мы б хацелі, каб сучасны кіраўнік аб'ядноўваў у сабе якасці абодвух. Менавіта таму мы вялікую ўвагу надаём распрацоўцы сістэмы псіхалагічнага адбору ўдзельнікаў праектаў, у тым ліку і «Мінскай змены».

У Клубе практычнай псіхалогіі «Зрабі сябе сам» асноўная ўвага надаецца будучым кіраўнікам-лідарам (студэнтам першага курса), сканцэнтраваным на самаразвіцці ў галіне прафесійна-асабовага росту. Для гэтага праводзяцца заняткі на тэмы «Правілы пастаноўкі мэт і мадэлі пастаноўкі мэт», «Фарміраванне асабістага іміджу», «Тэхналогіі творчага развіцця асобы», «Мастацтва публічных выступленняў» і інш. Праграма «Экалогія здароўя» скіравана на аказанне падтрымкі і прафілактыку стрэсавых сітуацый. Гэта цыкл практычных заняткаў па выкарыстанні тэхналогій, якія дапамагаюць зберагчы здароўе. Студэнты вучацца самаарганізацыі і эфектыўнаму выкарыстанню сваіх рэсурсаў у розных сітуацыях нявызначанасці.

— Акадэмія кіравання — гэта ўнікальная ўстанова адукацыі, дзе побач вучацца і студэнт, і міністр...

— Гэта так. І мы выкарыстоўваем цудоўную магчымасць перадаць моладзі карысны вопыт практыкаў найбольш кароткім шляхам.

Адукацыйны працэс, які традыцыйна лічыцца кансерватыўным, на самой справе не догма, ён пастаянна развіваецца, абнаўляецца, удасканальваецца. Цяпер мы гаворым аб новай эканоміцы — эканоміцы ведаў. Відавочна, што нам патрэбны кіраўнікі новага тыпу, якія будуць дасканала валодаць інфармацыйнымі тэхналогіямі, разуменнем сітуацыі, здольнасцю прымаць рашэнні ў абставінах нявызначанасці.

— А гэта, у сваю чаргу, абумоўлівае высокія патрабаванні да прафесарска-выкладчыцкага калектыву?

— Безумоўна. У Акадэміі кіравання павінны выкладаць людзі, здольныя вучыць таму, што будзе актуальным заўтра. У першую чаргу адзначу, што ў галіне кіравання ў нас сфарміравана свая выдатная навукова-выкладчыцкая школа. Акрамя таго, мы актыўна задзейнічаем патэнцыял практыкаў, якія паспяхова рэалізуюць свае функцыі лідара ў рэальным жыцці. Мы ўкараняем нетрадыцыйныя формы арганізацыі вучэбнага працэсу — напрыклад, майстар-класы, выезд на прадпрыемствы, стажыроўкі выкладчыкаў за мяжой і г.д.

Не толькі наша Акадэмія рыхтуе кіраўнікоў, але мы — своеасаблівыя заканадаўцы моды, узор для іншых, бо спрыяем фарміраванню заўтрашняй кіраўніцкай эліты. Наш статус абавязвае быць станоўчым прыкладам для іншых ВНУ. Адзін з нашых праектаў праходзіць пад дэвізам: «Мы можам і павінны зрабіць больш!» Гэтага прынцыпу мы імкнёмся прытрымлівацца і ва ўсёй сваёй рабоце. Як гаварыў наш дзяржаўны лідар, Акадэмія кіравання павінна рыхтаваць такіх кіраўнікоў, якія будуць клапаціцца пра наш народ, нашу дзяржаву, якія стануць асновай дзяржаўнай кадравай палітыкі.

Інга МІНДАЛЁВА.

Да Дня беларускай навукі

Фінансаванне навукі вырасла ў 2,7 раза

Як паведаміў **намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіі Ігар ВОЙТАЎ**, Дзяржпраграмай інавацыйнага развіцця ўстаноўлена павелічэнне фінансавых затрат на даследаванні і распрацоўкі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту ў 2010 годзе на ўзроўні 0,7 працэнта ад ВУП. Аднак, нягледзячы на тое, што аб'ём сродкаў на навуковыя праекты ў нашай краіне пастаянна павялічваецца, Беларусь пакуль адстае па навукаёмістасці ВУП ад іншых краін.

Паводле слоў Ігара Войтава, з павелічэннем фінансавання навуковай галіны ўмацоўваецца і патэнцыял інтэлектуальнай уласнасці. На пачатак 2011 года ў Беларусі дзейнічала 3,8 тысячы патэнтаў на вынаходніцтвы, зарэгістраваныя на імя беларускіх суб'ектаў, 2,5 тысячы патэнтаў на карысныя мадэлі, 591 патэнт — на прамысловыя ўзоры і каля 14 тысяч пасведчанняў на таварныя знакі і знакі абслугоўвання.

Айчыннымі прамысловымі прадпрыемствамі асвоены шырокі спектр імпартазамяшчальнай прадукцыі, якая раней у краіне не выраблялася. Гэта бясшоўныя гарачакатаныя трубы, паліраванае шкло, новыя аўтобусы, збожжаўборачныя камбайны і дызельныя рухавікі. Глыбіня перапрацоўкі нафты ўзрасла да 68 працэнтаў.

Мадэрнізаваны буйнейшыя ТЭЦ, пабудавана 6 міні-ГЭС і 3 ТЭЦ на мясцовых відах паліва. Доля айчынных лекавых сродкаў у рэспубліканскім пераліку даведзена да 41,5 працэнта, наменклатура асвоенай у вытворчасці фармпрадукцыі дасягнула 626 найменняў. Створана 11,8 тысячы працоўных месцаў...

Іна АРЭХАВА.

Пытальнік

Адкрыццё адукацыйнага цэнтра запланавана ў лютым

Прывітанне, шаноўная «Звязда»! Шчыры дзякуй, паважаныя журналісты, за родную газету на роднай мове. Не дачакацца таго аўторка, калі з вялікай асалодай для душы разгорнеш старонкі наступнага нумара любімай газеты.

Неяк у адным з такіх нумароў на першай старонцы я прачытала аб тым, што «ў студзені 2011 года плануецца адкрыццё Беларуска-індыйскага адукацыйнага цэнтра, дзе таксама будзе весціся падрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі IT-спецыялістаў кампаній Парка высокіх тэхналогій (ПВТ), выкладчыкаў профільных тэхнічных ВНУ, навучанне менеджараў у сферы інфармацыйных тэхналогій для прадпрыемстваў».

Падкажыце, калі ласка, месца знаходжання гэтай установы, і ці можна патэлефанаваць, каб запісацца на курсы.

Я выкладаю дысцыпліны, звязаныя з развіццём сучасных інфармацыйных тэхналогій. Сваю прафесійную кваліфікацыю ў асноўным павышаю праз інтэрнэт. Вельмі была рада даведацца аб адкрыцці адукацыйнага цэнтра па вывучэнні сучасных IT-тэхналогій.

Алена Іосіфаўна ШУЦЬКО, *г. Мінск.*

Дзякуй, паважаная Алена Іосіфаўна, за вашы добрыя словы, за адданасць газеце на роднай мове. Што ж тычыцца вашай просьбы, то, як мы удакладнілі ў адміністрацыі Парка высокіх тэхналогій, у студзені згаданы Беларуска-індыйскі адукацыйны цэнтр не адчыняўся. З Індыі ў нашу краіну пакуль прыехалі толькі тэхнічныя спецыялісты, якія зараз займаюцца аснашчэннем цэнтра, падключэннем тэхнікі. Паводле слоў работнікаў аддзела маркетынгу ПВТ, урачыстае адкрыццё Беларуска-індыйскага адукацыйнага цэнтра запланаванае на люты, а працаваць ён пачне, верагодна, яшчэ пазней. Зараз таксама немагчыма дакладна сказаць і пра тое, колькі чалавек змогуць запісацца на курсы, ці будуць яны платнымі або бясплатнымі — усе гэтыя і іншыя пытанні зараз знаходзяцца ў стадыі вырашэння. Але нас запэўнілі, што ўсе зацікаўленыя не прапусцяць звестак пра набор на курсы ахвотных, паколькі напярэдадні ў сродках масавай інфармацыі абавязкова будуць надрукаваныя адпаведныя аб'явы. Аднак і сама чытачка пры жаданні можа пакінуць сваю заяўку па электронным адрасе (info@park.by), або патэлефанаваць — у адміністрацыю ці аддзел маркетынгу Парка высокіх тэхналогій (нумары рэдакцыя паведаміла чытачцы асабіста). Застаецца толькі дадаць, што Беларуска-індыйскі адукацыйны цэнтр размесціцца на плошчах ПВТ у сталіцы па адрасе: вуліца Купрэвіча, дом 1, корпус 1, 9 паверх.

Маньякальная прага аўтобусаў?

Вадзіцель Бродніцкага крухмальнага завода з Іванаўскага раёна 27 студзеня звярнуўся ў міліцыю з заявай, што напярэдадні вечарам ад яго дома па вуліцы Савецкай у Іванаве сагналі службовы аўтобус «ПАЗ». Праз некалькі гадзін машына была знойдзена ў тэхнічна спраўным стане. Устаноўлены і злодзей, які пакатаўся на аўтобусе, 29-гадовы рабочы ПМК. Праўда, пакуль яго знайшлі, ён паспеў сагнаць яшчэ адзін аўтобус з вытворчай базы «Іванава» Пінскага аўтобуснага парка. Аўтобус «Радзіміч» быў заўважаны ля чыгуначнага пераезда Бродніца-Юхнавічы ў 15 км ад Іванава. На гэты раз аўтобус стаў прычынай аварыі. Машына сутыкнулася з дызель-цягніком, што рухаўся ў напрамку Пінска. На шчасце, ніхто не пацярпеў, толькі аўтобус і цеплавоз атрымалі механічныя пашкоджанні. Аварыя выклікала затрымку ранішняга дызеля, а пасажыры спазніліся і знерваваліся. На гэты раз згоншчык быў разам з непрацуючым напарнікам. Абое затрыманыя.

Яна СВЕТАВА.

І што з ім рабіць?

На 23-гадовага жыхара Баранавіч супрацоўнікі ДАІ за два гады склалі 37 пратаколаў. На сваім «Мерседэсе» ён рэгулярна парушаў правілы руху: перавышаў хуткасць, не карыстаўся поясам бяспекі, не прапускаў на пераходах пешаходаў...

Вадзіцеля штрафавалі, штрафы ён аплачваў своечасова.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Кіроўца «Жыгулёў» заснуў у салоне свайго аўто

з уключаным рухавіком на вуліцы Прытыцкага ў Мазыры і не заўважыў, што машына загарэлася. Магчыма, ад кароткага замыкання электраправодкі. На шчасце грамадзяніна, які, да таго ж, знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення, на пажар зрэагавалі грамадзяне, якія і выклікалі супрацоўнікаў МНС. Лёс падараваў мужчыне шанц і магчымасць асэнсаваць тое, што адбылося. У выніку пажару агонь знішчыў маторны адсек і часткова пашкодзіў салон аўтамабіля, паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Дыскусійная трыбуна

Ці зможа рознічны гандаль пражыць і без ліцэнзій, і без рэестра?

Ліцэнзаванне дзейнасці ў сферы рознічнага гандлю з 1 студзеня 2011 года ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 450 ад 1 верасня 2010 года захоўваецца толькі ў дачыненні да рознічнага гандлю алкагольнымі напоямі і тытунёвымі вырабамі. Такім чынам, амаль месяц беларускі рознічны гандаль працуе ў новых умовах без ліцэнзій, а таксама без гандлёвага рэестра, які павінен быў замяніць ліцэнзаванне. Пра тое, як сябе адчувае бізнэс, а таксама пра іншыя праблемы рознічнага гандлю і грамадскага харчавання мы пагутарылі з Віктарам МАРГЕЛАВЫМ, сустаршынёй Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва, уладальнікам некалькіх магазінаў і кавярняў.

— З першага студзеня адменены ліцэнзіі на рознічны гандаль. Часу прайшло не так шмат, але ўсё ж такі якая зараз сітуацыя ў гэтай сферы?

— З таго, што дакладваюць людзі з месцаў, магу сказаць што сітуацыя няпэўная: ні органы ўлады, ні прадпрымальнікі не ведаюць, як дзейнічаць. Бо раней пры ліцэнзаванні быў пакет дакументаў і пэўная працэдура, а на сёння адміністрацыйная працэдура быццам бы не мянялася, таму, атрымліваецца, трэба выконваць рэшткі былой працэдуры: толькі ўзгадніць асартыментны пералік у выканкаме і атрымаць заключэнне санітарна-эпідэміялагічнай службы на адкрыццё аб'екта. Як доўга будзе працягвацца такая сітуацыя — невядома, бо яшчэ летась у снежні былі гарачыя дэбаты наконт таго, як у краіне арганізаваць працэс кіравання адкрыццём і закрыццём аб'ектаў рознічнага гандлю і грамадскага харчавання.

— Вы маеце на ўвазе праект Указа Прэзідэнта аб гандлёвым рэестры?

— Спачатку праект называўся аб гандлі, потым аб гандлёвым рэестры, але сутнасць яго не мянялася: планавалася, што аб'ект гандлю ці грамадскага харчавання павінен быць унесены ў гэты рэестр па заяўляльным прынцыпе, а потым за пэўныя парушэнні мог быць адтуль выключаны. Праўда, на апошніх снежаньскіх нарадах у Савеце Міністраў выказваліся сумненні ў мэтазгоднасці вядзення гандлёвага рэестра і былі раздадзены даручэнні паглядзець, ці магчымае функцыянаванне нашага гандлю, адкрыццё-закрыццё аб'ектаў без вядзення такога рэестра. Пакуль на гэтым усё і скончылася.

— А на вашу думку, якім павінна быць рэгуляванне гандлю ў ідэале?

— Разумееце, залішні парадак з'яўляецца дрэнным, але і залішні хаос — таксама нядобра. Таму павінна быць разумнае спалучэнне: з аднаго боку, і таму ж прадпрымальніку працавалася б больш спакойна, калі б у яго была выпіска з гандлёвага рэестра, а з другога боку, не хацелася б паўтарыць негатыўных фактараў так званай «дазвальняльнай» сістэмы. Таму мы згодныя з заяўляльным прынцыпам уключэння ў рэестр, але настойваем на тым, каб рэестр не быў ісцінай у апошняй інстанцыі — ён павінен насіць інфармацыйны характар, а не ліцэнзуючы. Бо ў праекце ўказа Мінгандаль запісаў такі радок, што за два і больш парушэнняў правілаў вядзення гандлю прадпрыемства можа быць выключана з гандлёвага рэестра. А напісаць дзве скаргі на любы магазін няцяжка для любога чалавека, больш-менш знаёмага з правіламі гандлю, тым больш што гэтыя правілы ў нас звышжорсткія, накіраваныя часта не на здаровы розум, а на неадэкватную абарону спажыўца. І атрымаецца такая ж сітуацыя як і пры ліцэнзаванні: прадпрыемства будзе як на парахавой бочцы сядзець. Нельга выключаць з гандлёвага рэестра аб'екты гандлю ці грамадскага харчавання, бо інвестары і працоўны калектыў павінны быць упэўненыя ў заўтрашнім дні.

— А што падказвае міжнародны вопыт? Як там вырашылі гэтае пытанне?

— У іх там гандлёвы рэестр ёсць. Туды аб'екты ўключаюцца па заяўляльным прынцыпе і за парушэнні не выключаюцца. Там развітая судовая сістэма, і, калі суб'ект гаспадарання дапускае парушэнні, пакаранне прызначае суд. Нам таксама трэба пераходзіць на судовы парадак разбору — ён будзе больш справядлівы. Магчыма, для крам і кавярняў ён будзе больш жорсткі ў плане грашовых выплат, але затое ў іх з'явіцца стымул для працы і іх не будуць пастаянна тузаць: сёння ты працуеш, а заўтра — ужо не.

А па-другое, на Захадзе вельмі распаўсюджаны галіновыя асацыяцыі. І калі прадпрыемства ўваходзіць у асацыяцыю, то гэта з'яўляецца своеасаблівым знакам якасці, бо асацыяцыі ўсталёўваюць свае правілы і адсочваюць іх выкананне. Такім чынам, спажыўцы моцна падумаюць перад тым, як ісці ў краму, кавярню, рэстарацыю, якая не належыць да асацыяцыі.

— А што ў нас у Беларусі з асацыяцыямі? Можа, вам трэба стварыць сваё аб'яднанне і заняцца самарэгуляваннем, а не ўскладваць гэтыя функцыі на Мінгандаль?

— Гэта было б абсалютна правільным рашэннем, і людзі, знаёмыя з заходнім вопытам, разумеюць неабходнасць і відавочнасць такога кроку. У нас так склалася, што нашы міністэрствы праводзяць дзяржаўную палітыку ў той ці іншай галіне, але яны даволі рэдка адстойваюць інтарэсы суб'ектаў гаспадарання. І асацыяцыі маглі б вырашаць гэтыя праблемы. Мы падымалі пытанне, каб стварыць асацыяцыю грамадскага харчавання, і гэта атрымала падтрымку і ў Мінгандлі, і Мінгарвыканкам падтрымаў, і нават гаворка ішла пра магчымасць прадстаўлення нейкіх рэсурсаў на першыя часы. Але тут мы ўпіраемся ў тую праблему, што прадпрымальнікі самі не гатовыя, існуе нейкае нявер'е ў тое, што дэмакратычнымі метадамі можна дабіцца пэўных вынікаў. Ёсць таксама вопыт некаторых асацыяцый, калі яны ператвараюцца ў амаль што дзяржструктуры: замест дэмакратычных працэсаў (галасавання, балансу інтарэсаў) з'яўляецца падзел на кіраўніцтва і падначаленых. Дый, напэўна, наш дэмакратычны вопыт на працягу апошніх двух дзясяткаў гадоў накладвае свой адбітак: у нас вельмі мала людзей, здольных адкрыта абвясціць пра свае інтарэсы, гучна сказаць пра свае праблемы. Я ні ў якім разе не хачу сказаць, што ў нас мала разумных людзей — наадварот, у нас іх шмат, але большасць лічыць за лепшае адсядзецца, быць самім па сабе. У нас ёсць энтузіясты, і праца па стварэнні асацыяцыі грамадскага харчавання ідзе, вядуцца перамовы. Ёсць нават кола прадпрыемстваў, гатовых уступіць у асацыяцыю, але, на жаль, іх не так многа. Таму, напэўна, трэба гэтыя пытанні падымаць у комплексе: калі мы наладзім механізмы на ўзроўні дзяржавы, калі гэтая схема будзе лёгка ўбудоўвацца ў сістэму прыняцця рашэнняў, то тады будзе сэнс стварыць асацыяцыі. А калі асацыяцыю ніхто не будзе слухаць, то навошта яе ствараць?

— Вяртаючыся да ліцэнзавання і гандлёвага рэестра: а ці зможам мы пражыць і без таго, і без другога?

— У прынцыпе, зможам. Дарэчы, ведаеце, хто больш за ўсё зацікаўлены ў нейкім інструменце рэгулявання? Прадстаўнікі гандлёвых аддзелаў выканкамаў. Бо ім трэба з дапамогай гэтага інструменту вырашаць вялікі шэраг задач: як яны будуць без гэтага рэгуляваць працэнтныя адносіны беларускіх тавараў і імпартных? Як будуць прымушаць падпісвацца на ведамасныя часопісы? Як будуць людзей на кірмашы прыцягваць?.. А што тычыцца гандлю і грамадскага харчавання, то, мяркую, яны б працавалі не горш. Так, з'явіліся б некаторыя негатыўныя моманты з-за нядобрасумленных прадпрымальнікаў, але такіх было б не шмат, асабліва калі павярнуць пытанне ў судовую плоскасць, пра што я казаў раней.

— Як лічыце, адмена ліцэнзавання рознічнага гандлю будзе штуршком да росту бізнэсу ў гэтай галіне?

— Я не думаю, што гэта будзе прычынай значнага росту гандлю, хоць, вядома, пэўны эфект будзе пры ўмове адсутнасці іншых абмежавальных мер. Зараз самым важным пытаннем у развіцці гандлю з'яўляецца тое, які гандаль мы збіраемся развіваць. Напрыклад, інфармацыя і вопыт падказваюць, што гандаль на рынках імкліва губляе сваю ролю. За 2010 год яго доля ў агульным тавараабароце зменшылася з 35% да 24%. Такім чынам, мы бачым, што нават у крызіс людзі не пайшлі на рынкі: яны прывыклі да шырыні выбару, зручнасцяў, гарантый, якія ёсць у магазіна. Перспектыву ў нас мае буйны і сеткавы гандаль, але тут іншая небяспека: буйны гандаль заўсёды мае элементы манапалізму, а нам нельга згубіць канкурэнцыю. Таму павінны быць і гіпермаркеты, і буйныя ўніверсамы, і крамы каля дома, і шапікі на прыпынках...

— Ну, шапікаў на прыпынках у Мінску ўжо няма...

— Яшчэ не вечар — калі прыйдзе разуменне таго, што гэта зручна, то яны яшчэ, мяркую, вернуцца. Магчыма, не ў форме шапікаў, а ў форме малых крамаў каля дома — бо кожны з нас зацікаўлены, каб пад рукой быў аб'ект гандлю з таварамі штодзённага попыту. Хоць пакуль людзі яшчэ не разумеюць гэтага і імкнуцца ў гіпермаркеты: статыстыка перадnavагодняга гандлю паказала, што ў гіпермаркетах выручка цэлы тыдзень была большая ў 5 разоў за звычайную, а ў звычайных магазінах больш дробнага фармату толькі пару дзён была двух-трохразовая выручка.

— Калі не ліцэнзаванне, то што стрымлівае развіццё гандлю, скажам, у сталіцы?

— Напрыклад, я маю інтарэс пашыраць гандаль у Мінску. Якія ў мяне ёсць рэнтабельныя варыянты гэта зрабіць? Ніякіх. Адпаведна, мне няважна, трэба для гэтага ліцэнзія ці не, бо варыянтаў адкрыць сваю краму і так няма. Вядома, можна купіць магазін, які ўжо існуе. Але пры цэнах на ўзроўні 2 тысяч долараў за квадратны метр мае інвестыцыі ў яго набыццё ніколі не акупяцца (калі, безумоўна, не чакаць, як спекулянт, калі ён падаражэе і прадаць). Другі варыянт — узяць зямельны ўчастак і пабудаваць. Але для Мінска гэта — суперпраблема. Хоць у сталіцы існуе вялікая патрэба ў аб'ектах грамадскага харчавання, і перш за ўсё ў спальных раёнах. І прадпрымальнікі выступілі з ініцыятывай — распрацаваць і ўкараніць праграму невялікіх кавярняў каля дома: чалавек на 30-40, каб можна было бутэрброд з кавай з'есці, дзень народзінаў адсвяткаваць, вяселле, дый нават памінкі правесці. Аднак камітэт архітэктуры лічыць, што ў Мінску зямлі няма для такіх аб'ектаў. Здавалася б, глянь у акно — і знойдзеш, куды павільён для паслуг паставіць, хай нават і часовы, калі яны баяцца, што ён назаўсёды застанецца. Аднак камітэт па архітэктуры супраць і зямельных участкаў амаль няма. А тыя адзінкавыя, што ёсць, прадаюцца за шалёныя грошы на аўкцыёнах. Плюс яшчэ правіла, калі пакупнік павінен заплаціць гораду за права заключэння арэнды па 500 долараў за квадратны метр. Ну вось давайце палічым: калі я хачу паставіць невялічкую кавярню на 200 метраў квадратных (20 на 10 метраў), то мне патрэбен участак метраў 300 з перыметрам. Памнажаем 300 на 500 долараў і атрымліваем, што я павінен аддаць 150 тысяч долараў толькі за права заключэння арэнды без уліку ўсіх іншых маіх выдаткаў. Калі я ў гэтай кавярні «адаб'ю» такія грошы? Мы з лістамі звярталіся на гэтую тэму, і вось зараз нам сказалі: дайце канкрэтныя прапановы, якія ўчасткі прадпрымальнікаў цікавяць. А як такія прапановы даць? Я напішу, што маю цікавасць да нейкага ўчастка, яго выставяць на аўкцыён, прададуць камусьці іншаму і ўсё. Мне якая ад гэтага карысць? Ці вось я напішу пра ўчастак на 50 квадратных метраў, а некаму патрэбны на 70 ці на 30 квадратаў. Таму тут трэба стварыць механізм, а не гандляваць участкамі як таварам. Пакуль мы не сумясцім патрэбы бізнэсу, насельніцтва і інтарэсы камітэта архітэктуры, у нашым горадзе мала што зменіцца ў гэтым плане.

Павел БЕРАСНЕЎ.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

КОНКУРС РАШЭННЯЎ

Заданне № 15

Белыя: Kpe2, Лс2, Kb2, п. h2 (4).

Чорныя: Kpd4, Cg8, Kd8, п. c3 (4).

Выйгрыш.

Заданне № 16



Белыя: Kpd1, Фс7, Лg8, Kb1 (4).

Чорныя: Kpa2, Фе4, Ла1, пп. а3, b6 (5).

Нічыя.

КАМАНДНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ СВЕТУ ПА ШАХМАТНАЙ КАМПАЗІЦЫІ

Дзявятыя сусветныя камандныя спаборніцтвы па складанні шахматных задач і эцюдаў, арганізатарам якіх на гэты раз стала Італія, праводзяцца па сямі жанрах.

Кожная каманда можа выступіць па ўсіх тэмах з трыма творамі ў адным раздзеле. У залік жа ідуць дзве кампазіцыі. Суддзі раздзела, а іх — па пяць у кожным жанры ў абязлічаным выглядзе ацэньваюць творы ад 0 да 4 балаў без плюсоў і мінусаў.

Тэрмін прысылкі кампазіцый капітанамі каманд дырэктару IX WCCT — да 15 красавіка 2012 г.

Прыводзім тэмы чэмпіянату свету.

Двухходовая тэма. У двух падманлівых слядах праходзіць адна і тая ж пагроза «А». У другіх двух падманлівых слядах праходзіць адна і тая ж пагроза «В». У рашэнні ні «А» ні «В» не з'яўляюцца пагрозамі, але ўжо праходзяць матамі ў варыянтах. Прыклад: І. Кіс, 1983 г.

Белыя: Kpa7, Фb6, Лd1, Ле3, Cd2, Cg2, Kd8, Kh3, пп. а5, b2, c4, d3, е6 (13). **Чорныя:** Kpd4, Се8, Kc5, Kf5, пп е4, f6 (6). Мат за 2 хады.

1. Kb7? (2. Ф:c5x«А»), але 1... Kpe5! (а), 1. Cf1? (2. Л:е4x«В»), але 1... ed3! (в) 1. Лde1? (2. Cc3x«С»), але 1... K:e3x! (c). 1. b4? (2. Фc5x«А»), але 1... Kx3! (c), 1... Kf4? (2. Л:е4x«В»), але 1... Kpe5! (а), 1. Лg3? (2. Cc3x«С»), але 1... ed3! (b). Рашае. 1. е7!~Ф:f6x, 1... Kpe5(а) 2. Ф:c5x (А), 1... ed3 (b) 2. Ле4x (В)

1... K:e3(c) 2. Cc3x (С), 1... Kd6 2. Ф:d6x, 1... Cc6 2. K:c6x.

Трохходовая тэма. Не менш трох тэматычных варыянтаў аб'яднаны выразнымі (аднолькавымі або рознымі) сістэмамі хадоў як чорных, так і белых. Напрыклад: хадамі адной і той жа фігуры, хадамі на адно поле, цыклічным чаргаваннем, механізмамі становішча, гульнёй батарэі і г.д.

Тэматычныя элементы могуць быць паказаны на любым ходу або ў рамках сістэмнай сувязі 2-га і 3-га хода белых, або першага і другога хадоў чорных у адным варыянце.

Дапушчальныя некалькі фаз (рашэнне, ілюзорная гульня або падманлівыя сляды), хаця блізняты не дазволены. Аднак патрабуемая колькасць варыянтаў павінна быць уключана ў адну тэматычную фазу незалежна ад астатніх фаз. Прысутнасць тэмы ў сапраўдным рашэнні абавязкова. Пагроза можа быць адным з тэматычных варыянтаў (у гэтым выпадку тэма за чорных павінна быць выканана на другім ходзе чорных).

Прыклад: С. Пугачоў, 1949 г. І прыз, МТ М. Чыгорына.

Белыя: Kpb1, Фс1, Лh4, Cg8, Kd4, Ke2 (6).

Чорныя: Kpd3, Ла2, Ла6, Cc8, Ka1, Kb2, пп. а4, b4, е3, е4, е7 (11).

Мат за 3 хады.

Рашэнне. 1. Лh2!~2. Kc2 [K:b4, Ke1, Ф:e3] K:c2 3. Ф:c2x 1... е6 2. Kf3 [3. Kf4, Ke5, Ke1x] e:f3 3. Ch7x, 1... Ce6 2. Kb5 [3. Kf4x] Kc2 3. Ф:c2x, 1... Ле6 2. Kf5 (3. Kf4x) Kc2 3. Ф:c2x, 1... Лс6 2. K:c6.

Шматходовая тэма (мат у 4—6 хадоў). У задачы першы ход батарэі Зірса — гэта другі ход варыянта, а другі ход батарэі Зірса — гэта матуючы ход варыянта. Тэму можна назваць «прыпыненай» батарэяй Зірса.

Прыклад: Т. Лінс, 1987—88 г.

Белыя: Kph1, Лс7, Ca7, Cd3, Kb6, Kf3, пп. c2, е2, f5 (9).

Чорныя: Kpc5, Фе5, Cb1, Cf8, Kb7, Kc6, пп. а5, b3, b4, d6, f4, h7 (12).

Мат за 4 хады.

Рашэнне. 1. Лс8!~2. Ka8+ Kpd5 3. Kc7x.

1... Фе7 2. Ka4+ Kpd5 3. c4+ bc е.р. 4. K:c3x.

1... Фg7 2. Kc4+ Kpd5 3. е4+ f:e3 е.р. 4. K:e3x.

Эцюдная тэма. У эцюдзе на выйгрыш белы ферзь ходзіць без шаха і ўзяцця і не ў адказ на шах, на поле, дзе ён не абаронены і можа быць неадкладна знішчаны чорнымі.

Прыклад: Аліеў, 1999 г. **Белыя:** Kph4, Фа8, пп. а6, а7 (4).

Чорныя: Kpa1, Лg1, п. h2 (3). Выйгрыш.

Рашэнне. 1. Фh1 (1. Фh8+ Kpa2) 1... Лh1 2. а8 = ФЛg1 3. Фh1 Л:h1 4. а7 Лg1 5. а8 = Ф+ Kpb2 6. Фb8 і выйгрыш.

Астатнія тэмы чэмпіянату свету будуць апублікаваны ў наступным шахматным выпуску.

ИП «ГЕРБЕЛИНВЕСТ» ИНФОРМИРУЕТ,
что в соответствии с решением Администрации Московского района г. Минска от 11.01.2011 г. № 73 с 31.01.2011 г. **БУДЕТ ПРОИЗВОДИТЬСЯ УДАЛЕНИЕ ОБЪЕКТОВ РАСТИТЕЛЬНОГО МИРА НА ОБЪЕКТЕ: «Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенными помещениями общественного назначения по ул. Курганная в г. Минске».**
УНП 191068402.

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ!
ОАО «ОБУВЬТОРГ» сообщает о проведении 9 февраля 2011 года внеочередного собрания акционеров, которое состоится в актовом зале по адресу г. Минск, ул. Платонова, 28.
Регистрация участников проводится с 13.00 до 13.45 по предъявлению документов.
Начало собрания в 14.00.
Повестка дня:
1. О покупке ОАО «Обувьторг» акций Общества.
УНП 100262652 **Наблюдательный совет**